Краязнаўчы каляндар на 2025 год створаны на аснове энцыклапедычных выданняў: Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996 – 2004; Республика Беларусь: энцикл.: в 7 т. – Минск: БелЭн, 2005 – 2008; Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўн.: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1992 – 1995; кніг: Памяць: гіст.-дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мінск: БелЭн, 2004; Тумаш, В. Культура зямлі Астравецкай: асобы і творы. – Мінск.: "Беларускі кнігазбор", 2000; Герои Советского Союза: краткий биографический словарь в 2 т., Т. 2. – Москва: Воениздат, 1988.

Акрамя гэтага, пры падрыхтоўцы календара выкарыстоўваліся матэрыялы з папкі краязнаўчага фонду бібліятэкі "Хто ёсць хто на Астравеччыне", а таксама артыкулы раённай газеты "Астравецкая праўда" 1980 – 2024 гг.



*У 2025 годзе спаўняецца*:

**150 гадоў** са дня смерці Іосіфа Гашкевіча, першага консула Расіі ў Японіі, вучонага-арыенталіста, даследчыка, дыпламата, падарожніка.

**160 гадоў Антаніне Бернатовіч,** дырэктару гаспадарча-агародніцкай школы ў в. Крываносы.

Нарадзілася Антаніна ў 1865 годзе ў в. Казлоўшчына (цяпер Пастаўскі раён). Пачатковую адукацыю атрымала дома, потым скончыла Віленскую прыватную школу рукадзелля, пазней – пчалярска-агародніцкія курсы Варшаўскага таварыства агароднікаў.

У 1903 годзе яе, як умелага і вопытнага спецыяліста, запрасілі ў Крываносы, каб наладзіць навучанне агародніцкай справе. Пры школе была падсобная гападарка, дзе займаліся сушкай агародніны, строга па тэхналогіі. Прадукцыя экспанавалася на выстаўках, дзе заваёўвала прызавыя месцы. Антаніна Бернатовіч атрымала 33 медалі, у тым ліку 5 залатых і некалькі сярэбраных.

У 1-ю  сусветную вайну Бернатовіч займалася апекай дзяцей-бежанцаў і сірот. У Вільнове пад Вільняй арганізавала дзіцячы прытулак.

У 1916 годзе заразілася тыфам і памерла. Пахавана на бернардзінскіх могілках у Вільні.

**1 студзеня – 90 гадоў** з дня нараджэння **Філатавай Кацярыны Мікалаеўны,** заслужанага настаўніка Беларусі” (1974).

Нарадзілася Кацярына Мікалаеўна 1.01.1935 года.

Скончыла Маладзечанскі настаўніцкі (1955), Віцебскі педагагічны інстытуты (1961).

Працавала настаўнікам біялогіі Карвельскай, у 1958-95 гг. – Астравецкай (№ 1) сярэдніх школ.

**3 студзеня – 100 гадоў** з дня нараджэння **Пяткевіча Эдуарда Міхайлавіча,** заслужанага настаўніка Беларусі (1986).

Нарадзіўся Эдуард Міхайлавіч 3.01.1925 года ў в. Снігяны Смаргонкага раёна.

Скончыў Ашмянскае педвучылішча (1947), Мінскі педінстытут (1954).

З 1947 г. настаўнік Кавальскай пачатковай, з 1949 г. настаўнік, пазней завуч Рымдзюнскай сярэдняй школ. У 1954-90 гг. завуч, дырэктар, настаўнік Гервяцкай сярэдняй школы.

Узнагароджаны медалём "За доблесную працу" (1970).



**6 лютага – 65 гадоў** з дня нараджэння **Врановіч Тарэсы,** беларукай мастачкі.

Нарадзілася Тарэса 06.02.1960 года ў в. Ажуройсці.

Вучылася ў Вялікаякентанскай школе, потым на педагагічным аддзяленні Мінскага мастацкага вучылішча. У 1980 годзе паступіла ў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут на мастацказнаўчае аддзяленне.

Малюе алеем пейзажы, партрэты, нацюрморты. Ёю намаляваны або рэстаўрыраваны абразы для касцёлаў у Дайлідках, Градаўшчызне, Солах. Займаецца таксама разьбой па дрэве.

Жыве ў в. Дайлідкі.



**6 лютага – 65 гадоў** з дня нараджэння **Герасім Ірэны**, беларускай і літоўскай мастачкі.

Нарадзілася Ірэна 6.02.1960 года ў в. Ажуройсці.

Вучылася ў Вялікаякентанскай школе, потым на педагагічным аддзяленні Мінскага мастацкага вучылішча. У 1981 годзе паступіла ў Віцебскі педагагічны інстытут на мастацка-графічны факультэт.

У 1983 годзе пераехала ў Вільнюс, працуе на чыгунцы мастаком-афарміцелем.



**19 лютага – 135 гадоў** з дня нараджэння **Казіміра Сваяка (Канстанціна Стаповіча)**, паэта, драматурга, публіцыста, каталіцкага святара.

Нарадзіўся Казімір Сваяк 19.02.1890 года ў в. Барані. Тут жа атрымаў пачатковую адукацыю. Затым скончыў павятовую школу ў Свянцянах і духоўную семінарыю ў Вільні.

У 1915 годзе пасвячоны ў ксяндзы. Служыў вікарыем у парафіі Камаі Свянцянскага павета, потым у в. Клюшчаны Астравецкага раёна, дзе разгарнуў рэлігійную і грамадска-асветную дзейнасць, прысвяціў сябе служэнню Айчыне і роднаму народу.

Казімір Сваяк арганізоўваў у павеце беларускія школы, настаўніцкія курсы, стварыў касцельны хор, маладзёжную самадзейную суполку “Хаўрус сваякоў”, якая наладжвала для вяскоўцаў беларускія імпрэзы, ставіла спектаклі.

У 1924 годзе была выдадзена адзіная прыжыццёвая кніга “Мая ліра”.

Памёр Казімір Сваяк 6.05.1926 года ў Вільні.



**15 сакавіка – 90 гадоў** з дня нараджэння **Мечыслава Аляксандравіча Валуевіча,** заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі (1998).

Нарадзіўся Мечыслаў Аляксандравіч 15.03.1935 года на былым хут. Міхалінава Астравецкага раёна.

Скончыў Ваўкавыскі зоаветэрынарны тэхнікум (1973), Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут.

З 1961 года працаваў старшынёй Слабадкоўскага, Міхалішкаўскага сельсаветаў, у 1962 – 2003 гг. – старшынёй калгаса "Маладая гвардыя" 9з 1971 г. – "Шлях Леніна").



**23 сакавіка – 160 гадоў з** дня нараджэння **Старога Уласа (Уладзіслава Пятровіча Сівога-Савіцкага),** беларускага паэта.

Нарадзіўся Уладзіслаў Пятровіч у 1865 годзе ў г. Валожын Мінскай вобласці. Працаваў ляснічым на Варняншчыне.

Памёр у 1939 годзе.



**15 красавіка – 75 гадоў з** дня нараджэння **Самаль Аляксандры Барысаўны,** беларускага вучонага ў галіне біяфізікі.

Нарадзілася Аляксандра Барысаўна 15.04.1950 года ў в. Бруёўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці. У 1967 годзе закончыла Астравецкую

сярэднюю школу. Працавала на Астравеччыне ў райфінаддзеле, потым выкладала фізіку ў Варнянскай школе.

У 1974 годзе скончыла БДУ, дзе з 1975 года пачала працаваць.

Кандыдат біялагічных навук (1984), дацэнт (1999), Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2000 г.). Жыве ў Мінску.



**20 красавіка – 125 гадоў** з дня нараджэння **Клімовіча Адольфа Юстынавіча,** грамадскага і культурнага дзеяча, журналіста, выдаўца.

Нарадзіўся Адольф Юстынавіч 20.04.1900 года ў в. Клюшчаны.

Першую адукацыю атрымаў у беларускай школе, адкрытай па ініцыятыве К. Сваяка. У час вучобы ў Віленскай беларукай гімназіі быў адным з арганізатараў культурна-асветніцкага гуртка, які выдаў 7 нумароў часопіса “Маладое жыццё”. У 1921 годзе скончыў гімназію і беларускія настаўніцкія курсы. У 1922-28 гг. вучыўся ў Паражскай вышэйшай школе інжынераў сельскай і лясной гаспадаркі.

Узначальваў аддзел міжнародных зносін Аб’яднання беларускіх студэнцкіх арганізацый, удзельнічаў у міжнародных з’ездах і кангрэсах у Рыме, Жэневе і інш.

Пасля вяртання выкладаў у Віленскай беларускай настаўніцкай семінарыі імя Ф. Багушэвіча, у 1932-39 гг. рэдагаваў беларускі часопіс “Самапомач”.

У 1938 годзе польская адміністрацыя выслала яго з Вільні, некаторы час жыў у Варшаве.

У час 2-й сусветнай вайны працаваў у Беларускай народнай самапомачы ў Лідзе. Пасля вайны быў арганістам у Жылінах каля г. Тракай.

У 1952 годзе арыштаваны органамі НКУС, прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. У красавіку 1953

года растрэл заменены 25 гадамі лагераў. Вызвалены ў 1957 годзе.

Вярнуўся ў Вільнюс, дзе працаваў арганістам. Збіраў біяграфічныя матэрыялы пра віленскіх беларусаў, пісаў артыкулы пра захаванне спадчыны.

Памёр 24.11.1970 года ў Вільні.



**6 жніўня – 70 гадоў** з дня нараджэння **Альховіка Аляксандра Пятровіча,** кампазітара, паэта.

Нарадзіўся Аляксандр Пятровіч 6.08.1955 года ў в. Рэдкавічы Любанскага раёна Мінскай вобласці.

У 1979 годзе скончыў Гродзенскае музычна-педагагічнае вучылішча і быў накіраваны ў Астравецкі раён.

Музыкай захапляецца з дзяцінства. Напісаў на свае вершы больш за 100 песень. Апрацаваў больш за 20 народных беларускіх песень. Напісаў гімн беларускай міліцыі.

**14 верасня – 80 гадоў** з дня нараджэння **Адулы Тадэвуша Іванавіча,** беларускага філосафа, Доктара філасофскіх навук (1994), члена-карэспандэнта Міжнароднай славянскай акадэміі навук, прафесара (2004).



Нарадзіўся Тадэвуш Іванавіч 14.09.1945 года ў в. Хралы Астравецкага раёна.

**5 снежня – 105 гадоў** з дня нараджэння **Калгушкіна Мікалая Сцяпанавіча.**

Нарадзіўся 5.12.1920 года ў с. Лепня Лукаянаўскага раёна Ніжагарадской вобласці (Расія).

Скончыў рабфак, працаваў настаўнікам. Вучыўся ў Яраслаўскім ваенным вучылішчы, дзе і застала яго вайна.

З верасня 1942 года камандзір аддзялення, узвода, начальнік штаба атрада партызанскай брыгады “Няўлоўныя”. Удзельнічаў у знішчэнні нямецкіх гарнізонаў у Астравецкім раёне.

Пасля вызвалення Беларусі застаўся ў Астравецкім раёне: з ліпеня 1944 года – загадчык райфо, са студзеня 1945 года – г. сакратар выканкама райсавета, з верасня – старшыня планавай камісіі райвыканкама.

З’яўляўся дэпутатам раённага Савета дэпутатаў.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, медалямі “Партызану Айчыннай вайны” 1-й і 2-й ступеняў.

9 лютага 1950 года забіты антысавецкімі элементамі ў час правядзення справаздачнага сходу ў калгасе “Полымя” ў в. Дайлідкі

Пахаваны ў Астраўцы.

Адной з вуліц Астраўца прысвоена імя М. С. Калгушкіна.

***У 2025 годзе адзначаецца:***

**635 гадоў** назад быў заснаваны касцёл і кляштар у в. Быстрыца (1390).
**275 гадоў** назад пабудаваны касцёл Маці Божай Шкаплернай ў в. Жукойні-Жалядскія (1750).
**105 гадоў** з часу вызвалення тэрыторыі Астравецкага раёна ад польскай акупацыі (1920).
**85 гадоў** з часу ўтварэння Астравецкага раёна (1940) /15 студзеня/.
**85 гадоў** Астравецкаму раённаму аддзяленню міліцыі (26 лютага 1940 г.).
**85 гадоў** Астравецкаму райспажыўсаюзу (1940).
**85 гадоў** назад была адкрыта Астравецкая кантора сувязі (1940).
**80 гадоў** назад у Астраўцы пачаў працаваць райпрамкамбінат з лесапільнай, вапнавай і цагельнай вытворчасцю (1945).
**85 гадоў** назад пачала дзейнічаць Міхалішкаўская ўчастковая бальніца (верасень 1945 г.).
**70 гадоў** назад пачала дзейнічаць Янаўская ГЭС (1955).
**60 гадоў** з часу аднаўлення Астравецкага раёна (1965).
**50 гадоў** з часу адкрыцця помніка-манумента землякам, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (9 мая 1975 г.). Скульптар Ярамір Печкін.

## *Юбілеі з часу першага ўпамінання ў пісьмовых крыніцах паселішчаў Астравеччыны*

***635 гадоў*** в. Быстрыца Варнянскага сельсавета **(1390)**
***585 гадоў*** в. Радзюшы-Тушча Міхалішкаўскага сельсавета **(1440)**
***475 гадоў*** в. Забелішкі Міхалішкаўскага сельсавета, в. Падпруддзе, Тракелі Гудагайскага сельсавета **(1550)**
***445 гадоў*** в. Вялікія Стаўпяняты Спондаўскага сельсавета **(1580)**
***435 гадоў*** в. Гродзі, Шатэрнікі Гервяцкага сельсавета, в. Каценавічы, Радзюшы Міхалішкаўскага сельсавета, Шукльнікі Варнянкага сельсавета **(1590)**
***165 гадоў*** в. Антонішкі. Бяздданы, Вашкуны, Гайголі, Гялюны, Грэбалы, Завельцы, Кірэлі, Мацкі, Мільцэі, Міцюны, Пелегрында, Петрыкі, Попішкі Гервяцкага сельсавета, в. Бабічы, Градаўшчызна, Задворнікі, Захарышкі, Расолы, Рукшаны, Рымуні Гудайскага сельсавета, в. Мельнікі Варнянскага сельсавета, в. Мяшляны Міхалішкаўскага сельсавета **(1860)**
***155 гадоў*** в. Варзяны Падольскага сельсавета **(1870)**